# ВЯДОМЫ ВУЧОНЫ, ПЕДАГОГ І ГРАМАДСКІ ДЗЕЯЧ

*(Да 100-годдзя з дня нараджэння Ніны Васільеўны Каменскай)*

901(092)

28 снежня 2013 г. спoўнілася 100 гадоў з дня нараджэння вядомага беларускага вучонага, члена-карэспандэнта АН БССР Ніны Васільеўны Каменскай.

Нарадзілася яна ў г. Асіповічы Мінскай губерні ў сям'і рабочага-чыгуначніка. Пасля заканчэння сямігадовай школы ў 1929 г. паступіла ў педагагічны тэхнікум у г. Рагачоў. Скончыўшы яго, пачала працаваць настаўніцай няпоўнай сярэдняй школы ў в. Карытнае Асіповіцкага раёна.

У 1933 г. Ніна Васільеўна паступіла на гістарычны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута, пасля заканчэння якога ў 1937 г. стала настаўніцай гісторыі ў сярэдняй школе № 1 г. Магілёва. У 1938 г. яна была накіравана ў г. Бабруйск, дзе пачала працаваць інструктарам гарадскога аддзела народнай адукацыі і выкладчыцай гісторыі ў сярэдняй школе № 4. Але дасягнутыя поспехі не поўнасцю задавальнялі Ніну Васільеўну, і ў кастрычніку 1939 г. яна паступіла ў аспірантуру Інстытута гісторыі Акадэміі навук СССР. У жніўні 1941 г. у сувязі з эвакуацыяй інстытута з Масквы Ніна Васільеўна выехала ў Разанскую вобласць. Там яна ў маі 1942 г. уступіла ў рады ВКП(б), працавала загадчыцай парткабінета раённага камітэта ВКП(б).

У сакавіку 1943 г. Н.В.Каменская была выклікана ў Маскву для працягу даследаванняў. У верасні 1944 г. яна закончыла аспірантуру і паступіла на працу ў Інстытут гісторыі Акадэміі навук БССР, дзе была залічана на пасаду старшага навуковага супрацоўніка. Тады ж у складзе калектыва супрацоўнікаў Інстытута гісторыі АН БССР Ніна Васільеўна пераехала з Масквы ў Мінск.

У 1945 г. Н.В.Каменская паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэме "Образование Белорусской Советской Социалистической Республики", а ўжо ў маі 1946 г. была прызначана на пасаду намесніка дырэктара Інстытута гісторыі АН БССР. Праз два гады, у 1948 г., яна перайшла на працу ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, дзе была зацверджана на пасадзе загадчыка кафедры гісторыі БССР. Аднак сувязяў з Акадэміяй навук Ніна Васільеўна не парывала, заставалася працаваць на пасадзе старшага навуковага супрацоўніка па сумяшчальніцтве.



У жніўні 1950 г. у сувязі з аб'яднаннем кафедраў гісторыі БССР і гісторыі народаў СССР Ніна Васільеўна вярнулася ў Інстытут гісторыі АН БССР, дзе заняла пасаду загадчыка сектара гісторыі Савецкай Беларусі. У кастрычніку 1954 г. на аснове рашэння Прэзідыума АН СССР яна была накіравана ў дактарантуру Інстытута гісторыі АН СССР. На працягу некалькіх гадоў яна падрыхтавала і ў 1958 г. паспяхова абараніла доктарскую дысертацыю па тэме "Участие белорусского народа в разгроме интервентов и белогвардейцев и социалистическое строительство в Белоруссии в годы гражданской войны (1917—1920)".

Пасля вяртання ў верасні 1956 г. з Масквы працягвала загадваць сектарам гісторыі Савецкай Бе-

ларусі, а ў кастрычніку 1957 г. была прызначана на пасаду намесніка дырэктара па навуковай рабоце Інстытута гісторыі АН БССР. Яна працягнула свае навуковыя даследаванні, вынікі якіх ужо знайшлі да таго часу адлюстраванне ў манаграфіях "Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі" (Мн., 1946), "Образование Белорусского советского государства" (Мн., 2-е изд., 1948), "Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і ўтварэнне БССР" (Мн., 1954), "Первые социалистические преобразования в Белоруссии (25 октября 1917 — июль 1919 г.)" (Мн., 1957). У гэтых працах Н.В.Каменская комплексна даследавала гісторыю пачатковага этапу сацыялістычнага будаўніцтва, дзейнасць партыйных і савецкіх органаў па прыцягненні працоўных Беларусі да эканамічных, сацыяльных і культурных пераўтварэнняў.

Па ініцыятыве Н.В.Каменскай і з яе асабістым удзелам у складанні і рэдагаванні матэрыялаў сектарам гісторыі Савецкай Беларусі быў падрыхтаваны зборнік дакументаў і матэрыялаў "Из истории установления Советской власти и образования БССР" (Мн., 1954). Вынікі навуковай працы Інстытута гісторыі былі падведзены выданнем двухтомнай працы "Гісторыя Беларускай ССР" (Мн., 1958). Прызнаннем навуковых і навукова-арганізацыйных заслуг Н.В.Каменскай з’явілася выбранне яе ў 1959 г. членам-карэспандэнтам АН БССР.

У маі 1962 г. Н.В.Каменская была зацверджана на пасадзе дырэктара Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, а ў студзені 1965 г. стала дырэктарам Інстытута гісторыі АН БССР. Займаючы гэтыя пасады, Ніна Васільеўна аказвала ўплыў на вызначэнне кірункаў навуковых даследаванняў. Пры яе актыўным удзеле як аўтара і рэдактара былі падрыхтаваныя і выдадзеныя наступныя буйныя калектыўныя працы: двухтомная "История Белорусской ССР" (Мн., 1961), "Победа Советской власти в Белоруссии" (Мн., 1967), "Гісторыя Мінска" (Мн., 1967), "Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии" ў 2-х частках (Мн., 1968), пяцітомная "Гісторыя Беларускай ССР" (Мн., 1972—1975), "История Белорусской ССР" (Мн., 1977).

З 1969 па 1974 г. Ніна Васільеўна працавала прарэктарам па навуковай рабоце Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М.Горкага. Па яе ініцыятыве ў інстытуце адкрылася кафедра гісторыі БССР, якую яна ўзначальвала на працягу пяці гадоў. Усе гэтыя гады пры кафедры працаваў навукова-даследчы гурток для студэнтаў, якія жадалі паглыбіць свае веды і навучыцца праводзіць навуковыя даследаванні.

У верасні 1974 г. Н.В.Каменская зноў вярнулася ў Інстытут гісторыі АН БССР, дзе да жніўня 1979 г. працавала старшым навуковым супрацоўнікам, а потым да сакавіка 1984 г. — старшым навуковым супрацоўнікам-кансультантам. У гэтыя 10 гадоў Ніна Васільеўна, вызваліўшыся ад нагрузкі адміністрацыйнай работы, сканцэнтравала ўсе свае сілы на навукова-даследчай дзейнасці. Яна занялася даследаваннем такой тэмы, як станаўленне народнай адукацыі і праявдзенне культурнага будаўніцтва ў Беларусі ў першыя гады савецкай улады. Вынікі гэтых даследаванняў былі апублікаваныя ў манаграфіі "Становление народного образования в Белоруссии (1917—1920 гг.)" (Мн., 1980). Працягвалася даследаванне і падзей Кастрычніцкай рэвалюцыі, што знайшло адлюстраванне ў працы "Великий Октябрь в Белоруссии" (Мн., 1977, у сааўт. з П.А.Селіванавым), а таксама ў раздзелах і параграфах калектыўных выданняў, навуковых артыкулах у часопісах.

Ніна Васільеўна Каменская пакінула пасля сябе значную навуковую спадчыну — больш за 150 навуковых прац, у тым ліку 7 манаграфій і 21 брашуру, больш за 90 навукова-папулярных артыкулаў у перыядычным друку. Па праве можна сказаць, што сваімі працамі, навукова-арганізацыйнай дзейнасцю яна ўнесла важкі ўклад у распрацоўку гісторыі ўсталявання савецкай улады ў Беларусі.

Пры гэтым Ніна Васільеўна не абмяжоўвалася выключна навуковай і навукова-арганізацыйнай дзейнасцю. Яна актыўна працавала і як педагог — загадвала кафедрамі гісторыі Беларусі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У.І.Леніна і Мінскім педагагічным інстытуце імя А.М.Горкага, чытала курс лекцый па гісторыі Беларусі, прымала ўдзел у падрыхтоўцы дапаможнікаў для сярэдніх школ і вучэбных праграм па гісторыі БССР для вышэйшых навучальных устаноў. Пад яе навуковым кіраўніцтвам былі абаронены 23 кандыдацкія дысертацыі. У 1961 г. ёй было прысвоена вучонае званне прафесара.

Таксама Н.В.Каменская прымала актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці краіны. Яна з’яўлялася старшынёй навукова-метадычнага савета па прапагандзе гістарычных ведаў Рэспубліканскага аб’яднання "Веды", выязджала ў навуковыя камандзіроўкі ў Польшчу, Чэхаславакію, была ў складзе дэлегацый СССР у Кітайскай Народнай Рэспубліцы і на XVI сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у ЗША.

Прызнаннем плённай навуковай, арганізацыйнай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці Н.В.Каменскай з’явілася ганараванне яе высокімі ўрадавымі ўзнагародамі: двума ордэнамі "Знак почёта" (1949, 1967), ордэнам Дружбы народаў (1979), медалямі "За доблестный труд в Великой Отечественной войне 1941—1945 гг." (1945), "За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения Владимира Ильича Ленина" (1970), "Тридцать лет Победы в Великой Отечественной войне 1941—1945 гг." (1975), "Ветеран труда" (1979), чатырма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР (1960, 1963, 1974, 1984). У 1981 г. ёй было прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча навукі БССР.

Ніна Васільеўна пайшла з жыцця 22 сакавіка 1986 г. Яна пакінула надзвычай добрую памяць аб сябе як аб даследчыку, арганізатару навукі, навуковым кіраўніку і педагогу. Добрая памяць аб ёй жыве ў сэрцах яе вучняў і ўсіх тых, хто працаваў разам з ёй.

**Георгій Карзенка,** *доктар гістарычных навук,*
**Міхаіл Смальянінаў,** *кандыдат гістарычных навук.*